




Рака Лясная з Камянецкай вежы

# Мы – Захавальнікі ТВП "Рака Лясная"!




Вадзім Пракапчук

Вадзім Кузько

Антон Кузьміцкі

Калі Вы жывяце каля пойм рэк Лясная, Правая і Левая Лясная ці маеце магчымасць наведваць іх, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Рака Лясная" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Рака Лясная", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

Здымкі: А. Асташэня, М. Верабей, В. Краўчук, С. Плыткевіч, В. Пракапчук, С. Сідарук, Дз. Якубовіч, www.shutterstock.com

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 409

Грамадская арганізацыя
**"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org

Тэрыторыя, важная для птушак

# РАКА ЛЯСНАЯ



BirdLife International Partner

Праект фінансуецца ЕС

BirdLife IBA Тэрыторыя важная для птушак


*Шэрыя гусі з птушанятамі*

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП "Рака Лясная" часткова ахоплівае поймы і даліны рэк Лясная Правая і Лясная Левая, а таксама р. Лясной пасля іх зліцця каля в. Вугляны да яе ўпадзення ў р. Заходні Буг. Рэчышча р. Лясной разам з прытокам – р. Правай Лясной – захавалася ў нязменным стане. Гэта амаль адзіная такая рака на паўднёвым захадзе Беларусі.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Рака Лясная"

**1** Некаторыя віды кулікоў, качак, гусей робяць тут свой першы прыпынак у нашай краіне падчас веснавога пералёту з Заходняй Еўропы. А для гусей гэта адзін з асноўных шляхоў міграцыі пры пералёце з Захаду на Усход.


*Белалобыя гусі*

**2** За перыяд вясновай міграцыі дадзеным шляхам пралятае больш за 60 000 птушак. Найбольш шматлікія з іх – белалобая гусь, гусь-гуменніца, качка-свіцьва, крыжанка, качка-шылахвостка, кнігаўка.


*Качка-свіцьва (самец і самка)*

**3** У залежнасці ад пагодных умоў і характару паводкі буйныя чароды птушак затрымліваюцца тут на тэрміны ад некалькіх дзён да тыдня і нават даўжэй.

**4** Значнасць тэрыторыі для мігруючых водна-балотных птушак была пацверджана яшчэ ў сярэдзіне XX ст., калі тут упершыню ў нашай краіне арнітолаг з Белавежскай пушчы Васіль Гаўрын арганізаваў навуковыя даследаванні веснавой міграцыі.

**5** Рака Лясная – патэнцыйная Рамсарская тэрыторыя і плануемы аб'ект Ізумруднай сеткі.

## Што пагражае ТВП "Рака Лясная"?

- Парушэнне гідралагічнага рэжыму праведзенымі меліяратыўнымі работамі, у выніку якіх асушаны пойменныя нізінныя балоты перасталі назапашваць вільгаць. Цяпер падчас працяглых дажджоў назіраецца хуткі сток вады з каналаў у раку, што пры несвоечасовым адкрыцці шлюзаў на ёй вядзе да паводкі ў пойме і замораў рыбы.



- Забруджванне ўгнаеннямі і ядахімікатамі праз стокі з сельскагаспадарчых палёў і жывёлагадоўчых ферм.
- Зарастанне поймы і адкрытых біятопаў шматгадовай пустазельнай і хмызняковай раслiннасцю з-за заняпаду традыцыйнага сенакашэння і выпасу жывёлы.
- Разворванне пойменных земляў (асабліва ў прыбярэжнай паласе і водаахоўнай зоне) і вырошчванне прапашных сельскагаспадарчых культур.
- Выпальванне травяністай раслiннасці, асабліва вясной. У такіх пажарах гінуць усе глебавыя арганізмы, а ў больш позні час – і птушыныя гнёзды.

